# Беларускія народныя загадкі як сродак інтэлектуальнага развіцця

Сычова І.С., кандыдат педагагічных навук, дацэнт

# Эпіграф

- *Загадка - разгадка, ды сем вёрст праўды.*


Беларускія
загадкі
Мінск «Юнацтва» 1989


ДЗІЦЯЧЫ ФАЛЬКЛОР

# ПЕДАГАГІЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ НАРОДНЫХ ЗАГАДАК

- **Перадаюць з пакалення ў пакаленне этнічную карціну свету** (гукі, колеры, вобразы, асацыяцыі, граматычная будова фраз і інш).
- **Узбагачаюць слоўнікавы запас, вучаць адчуваць лексічныя, фанетычныя і сінтаксіныя даметнасці роднай мовы**: гульню слоў, рытм і рыфму; разумець намёкі і народны гумар.
- **Знаёмяць з поглядам беларусаў на прыродныя стыхіі, раслінны і жывёльны свет, рэаліямі традыцыйнай беларускай культуры і побыту.**
- **Трэніруюць памяць, прывучаюць заўважаць характэрныя дэталі, трапна і лаканічна выказваць думку.**

# Педагагічныя асаблівасці народных загадак

- **Актывізуюць інтэлектуальныя і творчыя магчымасці**, **разбураюць стэрэатыпы**, дазваляюць паглядзець на з’явы прыроды, чалавечае жыццё, працоўныя дзеянні, знаёмыя побытавыя рэчы ў іншым ракурсе.
- **З’яўляюцца паказчыкам назіральнасці, кемлівасці, выпрабоўваюць мысленне на хуткасць, гнуткасць, вастрыню,**
- **Вучаць аналізаваць, класіфікаваць, параўноўваць, супастаўляць, абагульняць, сістэматызаваць прадметы і з’явы.**
- Перадаюць жыццёвую мудрасць пакаленняў, **далучаюць да народнай філасофіі,** утрымліваюць, жыццёвыя назіранні і абагульненні.
- Выпрабоўваюць, правяраюць веданне народнай мудрасці, прыналежнасці да пэўнага этнасу.

# Час, філасофія жыцця

- **Што любіш – не купіш, а чаго не любіш – не прадасі** (Маладосць, старасць).
- **Уранку на чатырох, удзень на дзьвюх, а ўвечары на трох** (Чалавек у розным узросце).
- **Прыйшоў нехта, узяў нешта: ні яго дагнаць, ні ў яго атабраць** (Смерць).

# Чалавек, сям'я, сваяцтва

**Стаіць два стаўбца, на стаўбцах – дзежка, а ў дзежцы – гладышка, а на гладышцы – гаршчок, а на гаршку – лес, а ў лесе тавар ходзіць** (*Чалавек*).

- **Пяць братоў у адну ноч нарадзіліся, а ростам не роўныя** (*Пальцы*).
- **Два браткі ля аднае хаткі** (*Вочы каля носа*).
- Мяккае, бухонае, на стале не бывала, а ўвесь свет узгадавала (*Грудзі*).
- **Дзве дачкі, дзве мацеры і бабулька з унучкай. Колькі ўсіх?** (Трое: бабка, маці і дачка).

# Традыцыйны побыт

- **Радзіўся – круглі́ўся, у агні хрысціўся, а прыйшлося паміраць – няма каму касцей пахаваць** (Гаршчок).
- **Пад ліпавым кустом мяцеліца мяце** (Муку сеюць на сіта).
- **Два браты бягуць, а два даганяюць і дагнаць не могуць** (Колы ў возе).
- **Старая баба дзетак усю зіму грэе** (*Печка*).

# Загадкі-задачы

1. **Ішло сем баб, у кожнае бабы па сем кіёў, на кожном кію па сем сукоў, на кожном суку па сем кашалёў, у кожном кашалю па сем кошак, у кожнае кошкі па семера кацянят.** Сколькі ўсяго будзе?

2. **Ляцела сто гусей, аж ідзе чалавек дай кажа:**

**- Здаровы, сто гусей!**

**- Здароў, чалавеча, - кажуць,- калі б нас яшчэ столькі, да яшчэ палавінка етаго, да яшчэ чвертка етаго і ты з намі, дак тагды б было нас сто.**

# Загадкі ў народных песнях, абрадах

- **- Што бяжыць без повада?** (Вада).
- - **Што расцець без кораня?** (Камень).
- **- Што гарыць без полымя?** (Зара).
- **- Што бела не белячы?** (Лебедзь).
- **- Што чорна не чэрнячы?** (Воран).

# Загадкі ў народных казках

- Суд мой будзе такі. Я загадаю вам тры загадкі: *што на сьвеце сыцей за ўсё, што на сьвеце саладзей за ўсё, што на сьвеце шпарчэй за ўсё?*
- **Няма нічога сыцей за зямлю, бо яна ўсіх корміць;**
- **няма нічога саладзей за сон, бо хоць якое гора, а засьнеш дык і забудзешся;**
- **і няма нічога шпарчэй за людзкія думкі, бо сам ты яшчэ тут, а думкі ўжо далёка-далёка… *(З казкі “Разумная дачка”)***

# Формы работы з народнымі загадкамі

- **Гутаркі па зместу загадак,** тлумачэнне слоў, з'яў традыцыйнай культуры.
- **Падбор загадак по пэўнай тэматыцы,** аб канкрэтным прадмеце ці з'яве, па сродках вобразнасці і інш.
- **Аднаўленне, "збіранне" загадак (**з прапушчанымі літарамі, словамі, перабблытанымі часткамі).
- **Рэдагаванне загадак** (замена слоў, або частак на іншыя).
- **Складанне ўласных загадак.**

# Формы работы з народнымі загадкамі

- **Мовазнаўчыя і літаратуразнаўчыя заданні**: знайсці дзеясловы дзеяння і руху, канкрэтныя і абстрактныя назоўнікі, параўнанні, алегорыі, гіпербалы, метафары, паўтарэнні, вызначыць рытм, рыфму і інш.
- **Адгадванне загадак,** віктарыны, конкурсы знаўцаў народных загадок.
- **Малюнкі да загадак** «Адгадай загадку і намалюй адгадку».
- **Паказ загадак** (адгадак) **з дапамогай мімікі і жэстаў** («Кракадзіл»).
- **Параўнанне народных загадак на розных мовах,** выяленне агульнага і адметнага.

# НАМАЛЮЙ АДГАДКУ

- Дуб-дубавік, 12 галінак, на кожнай галіне па 4 гняздзіны, у кожнай гняздзіне па 7 птушанят, кожнае мае сваё імя. Хто адгадае, што за сям'я? (*Год, месяц, тыдзень, дзень*).
- Вясной весяліць, летам халадзіць, увосень пітае, зімой саграває (*Дрэва*).
- У чубатых дочак па сямсот сарочак, па сямсот спаднічак, а без чаравічак (*Куры*).

# Тэматычны падбор загадак

- **Ні вокан ні дзвярэй - поўна хатка людзей.**
- **Семсот муляроў збудавалі дом без вуглоў.**
- **У цёмнай цямніцы панны кросны ткуць.**
- **Каля вуха хавіруха, а на вуліцы кірмаш.**

**Пчолы ў вуллі**

- **Што плача і жалю няма?** (Скрыпка).
- **У ліпавым кусце мядзведзь равець** (Цымбалы).
- **У лесе выразана, гладка вычасана, ажно заліваецца, як называецца?** (Дудка)
- **Сам пусты, голас густы, дроб выбівае, людзей сабірае** (Бубен).

**Музычныя інструменты**

# Тэматычны падбор загадак

- **Рыкнуў вол на сем сёл** (гром).
- **Пад зямлёю пеўнік пяе** (плуг).
- **Не бразгае дзвярыма, у вокны не грукоча, а ў хату зойдзе, калі захоча** (святло).

- **Чорная карова ўсіх людзей пакалола, а белая ўстала, усіх пападымала** (ноч і дзень).
- **На паляне сіняй пасецца конь сівы (месяц на небе).**
- **Повен падпечак чырвоных яечак** (жар, вуголле)

Слыхавыя вобразы

Зрокавыя вобразы

# ЛІТАРАТУРА


1. **Беларускія загадкі** /складальнік Янка Саламевіч; мастак Рыта Цімохава. – Мінск: Юнацтва, 1989. – 63с.
2. **Пяткевіч, Ч. Рэчыцкае Палессе** / Часлаў Пяткевіч; уклад., прадм. У. Васілевіча; пер. з пол. Л.Салавей і У.Васілевіча. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2004. – 672 с.
3. **Хто адгадае? Беларускія народныя загадкі** /уклад. і прадм. З.Санько. – Мінск: Тэхналогія. – 32 с.